*В. А. Пілецкі,*
*прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Мінскага інстытута кіравання, доктар гістарычных навук*

# «АДРОЧАНЫЯ» КНІГІ КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА ЯК АДНА СА З'ЯЎ ПАЎСЯДЗЁННАСЦІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ XII ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Адрочаныя» кнігі (тут і далей пераклад тэрмінаў на беларускую мову А. А. Мельнікава; рус. «отреченные», царк. «отреченыа») – гэты тэрмін ужыты вядомым хрысціянскім прапаведнікам старажытнай Беларусі, кіраўніком епіскапскай кафедры ў г. Тураве – Кірылам Тураўскім (каля 1113 – пасля 1190) у адным з яго твораў-пропаведзяў, што атрымаў назву «Слово святаго Кирила о книжнем почитании и о учении» [7, с. 447]. Знакаміты прапаведнік прызваў сваю паству («послушайте, братие, и разумейте, чада...») не чытаць «адрочаных» кніг, а грунтавацца выключна на хрысціянскіх кнігах, такіх як Евангелле, Апостал, Пераміўнік, Псалтыр і інш., бо толькі яны, на яго думку, з'яўляюцца Святымі кнігамі і могуць навучыць, як належыць вераваць у адзінага Бога, а значыць, і ажыццявіць выхаванне падрастаючых пакаленняў. Што ж гэта былі за кнігі, якое месца ў тагачасным выхаванні і адукацыі яны займалі і чаму кіраўнік хрысціянскай епархіі ў Тураўскім княстве прысвяціў спецыяльную пропаведзь, каб паведаць сваім прыхажанам аб немагчымасці выкарыстання іх для навучання і выхавання?

Перш чым адказаць на сфармуляваныя пытанні, акрэслім паняцце «выхаваўча-адукацыйны працэс» і вызначым прыблізныя параметры яго зместу. Інакш, адкажам на пытанне, якім ведам вучылі падрастаючыя пакаленні ў той час і наколькі небяспечным было для хрысціянскай царквы чытанне тагачасным насельніцтвам так званых «адрочаных» кніг.

Выхаваўча-адукацыйны працэс падрастаючага пакалення (інакш – перадача вопыту, накопленага грамадствам, ад былых пакаленняў будучым) на тэрыторыі нашай краіны, як і ў іншых землях, пачаўся разам з узнікненнем чалавека і чалавечага грамадства [9]. У гісторыі чалавецтва ён ажыццяўляўся з самых найстаражытных часоў, яшчэ задоўга да з'яўлення школы як структуры для

навучання і выхавання дзяцей. Формы выхавання і адукацыі (інакш – гістарычнай трансляцыі грамадскага вопыту) падчас родавай абшчыны складваліся шляхам паўсядзённага напалову ўсвядомленага жыццёвага накаплення рознапланавых ведаў. Дзеці не былі аддзелены ад астатняй часткі родавага калектыву. Яны былі сведкамі і ўдзельнікамі ўсіх паўсядзённых акцый ранняродавай супольнасці. Вобраз жыцця тагачаснага грамадства насіў калектыўна-абрадавы характар. Шырока выкарыстоўвалася выяўленчае мастацтва, магія, знахарства і астралагічныя назіранні.

У пераддзяржаўны перыяд, калі ўжо мелася маёмасная дыферэнцыяцыя насельніцтва (для Беларусі гэта прыблізна VII–VIII стст. н.э.), існавала адзіная жорстка абавязковая форма выхаваўча-адукацыйнага працэсу. Яна ўяўляла сабой ізаляванне, на даініцыяцыйны перыяд, усіх без выключэння маладых людзей у спецыяльна пабудаваных дамах («лясных дамах», «хатках», ці «дамах моладзі»), дзе іх выхаваннем і адукацыяй займаліся спецыяльна прызначаныя тагачаснымі структурамі грамадскага парадку людзі: жрацы, старэйшыны, знахары ці інш. Такі этап выхаваўча-адукацыйнага працэсу заканчваўся як правіла комплексам пасвячальна-выпрабавальнай абраднасці ўзроставых ініцыяцый. З пашырэннем дыферэнцыяцыі насельніцтва на багатых і бедных узніклі новыя формы выхаваўча-адукацыйнага працэсу, што адпавядалі чатыром важнейшым сацыяльным групам насельніцтва, якія існавалі ў той час: сяляне-абшчыннікі, рамеснікі, племянная знаць, што паступова феадалізавалася, і язычніцкія жрацы. Частка гэтых форм была традыцыйнай (простанароднай), а іншыя былі разлічаны на прывілеяваныя групы насельніцтва.

Што тычыцца зместу выхавання і адукацыі, то ў дахрысціянскі перыяд ён складаўся з эканамічных, сацыяльна-абрадавых, ідэалагічных ведаў, патрэбных для валодання культурай, назапашанай да таго часу грамадствам [10]. Важнейшымі кірункамі фарміравання зместу былі: набыткі асноўных груп грамадства – класавыя ідэалы, хітрасці прафесій, ідэалогія; валоданне навыкамі матэрыяльнай вытворчасці; веданне абрадавай дзейнасці; назвы мер вагі, адлегласці і колькасці; навык графічнай перадачы інфармацыі, заснаваны на рунах; нормы маралі («мудрасць першанастаўнікаў» – кодэкс грамадскіх паводзін, правілы адносін палоў, ідэалагічныя і палітычныя нормы) і многае іншае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гаворка пра змест выхаваўча-адукацыйнага працэсу дахрысціянскай Беларусі была б няпоўнай, калі б не было сказана пра астралагічна-астранамічныя веды, тлумачэнне сноў, варажбу, вядзьмарства і іншыя светапоглядна-практычныя з'явы, якія займалі ў жыцці дахрысціянскага чалавека даволі значнае месца [2]. Цяжка дапусціць, што дахрысціянскія выхавальнікі, арганізатары ўзроставых ініцыяцый і іншых форм падрыхтоўкі тагачаснай моладзі не паведамлялі сваім выхаванцам пры перадачы грамадскага вопыту звесткі, напрыклад, з астралагічнай практыкі альбо варажбы [4]. Вядома, што дахрысціянскае грамадства ўвогуле, не толькі ў межах Беларусі, але і ў грэка-рымскім рэгіёне ды іншых частках свету, было прасякнута астралагічна і варажбіцка-знахарскай або «вядзьмарскай» практыкай [1, с. 57–58].

Астралогія шырока ўжывалася падчас Антычнасці і Сярэдніх вякоў як вынік «уплыву» на зямныя з'явы размяшчэння зорак. Яна выконвала пэўныя функцыі ў выглядзе прадказальніцкай «навукі», давала звесткі аб нябесных целах і свяцілах [6]. Увогуле тлумачэнне размяшчэння зорак і планет, як мяркуюць даследчыкі, пачалося з абагаўлення большасцю першабытных народаў нябесных свяцілаў адпаведна тагачаснаму міфалагічна-магічнаму грамадскаму мысленню і працягвалася ажно да XIX–XX стст., а ў асобных выпадках і ў сучаснасці [3].

Класічным прыкладам прадказальніцы (шырока прадстаўленым як у навуковай, так і ў мастацкай літаратуры [12]), была старажытнагрэчаская жрыца Піфія, што знаходзілася ў храме Апалона ў Дэльфах і атрымала назву Дэльфійскага аракула. Згодна паданню, Апалон пасля перамогі над пачварным драконам Піфонам, сынам багіні падземнага царства Геі, заснаваў Піфійскія гульні (якія, як і Алімпійскія, праводзіліся праз пэўны перыяд часу), а таксама піфійскі аракул (прадказальню), дзе ад яго імя прадказваліся будучыя падзеі. Жрыца звычайна, сядзела ў зале храма на трыножніку і ў стане экстазу адказвала на пытанні прадстаўнікоў грэчаскіх гарадоў-дзяржаў і грамадзян. Адказы Піфіі, часта цмяныя і двухсэнсоўныя, перакладаліся жрацамі ў вершаваную форму і лічыліся прадказаннямі (аракуламі) самога Апалона [11, с. 393].

Пазней на службу астралогіі і варажбе была пастаўлена пісьменнасць. Вядомыя творы многіх антычных аўтараў утрымлівалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мноства звестак у названай галіне. Існавала таксама і літаратура, якая была цалкам прысвечана астралагічным распрацоўкам. Чарадзейства, вядзьмарства і варажба таксама былі значна пашыранымі з’явамі ў асяроддзі дахрысціянскага насельніцтва Еўропы [16]. Яскравым пацверджаннем чарадзейства і звязанай з ім ідэалогіі насельніцтва Беларусі з часоў першабытнасці служаць так званыя чарадзейныя казкі і паданні [19]. Варажба і вядзьмарства ў асяроддзі грамадства на тэрыторыі Беларусі таксама не з’яўляліся нечым невядомым [8]. Дастаткова сказаць, што Статут ВКЛ 1588 г., як і ранейшыя, лічыў чарадзейства крымінальным злачынствам [15]. Пік барацьбы з «ведзьмамі» і чарадзеямі, што «мелі – згодна з тэорыяй царкоўных тэолагаў Сярэднявечча – непасрэдную сувязь з нячыстай сілай і пакланяліся д’яблу», у Беларусі прыпаў на канец XVI–XVII ст. [6, с. 32–37].

Канешне ж насельніцтва Беларусі яшчэ задоўга да прыняцця хрысціянства дзякуючы пашырэнню асветніцкіх працэсаў было знаёма, у той ці іншай ступені, з ведамі, а то, не выключана, і з літаратурай падобнага зместу, нягледзячы на тое што афіцыйнага распаўсюджання пісьменнасці яшчэ не адбылося [13]. Менавіта пацверджаннем сказанаму і з’яўляецца твор нашага знакамітага земляка, хрысціянскага асветніка XII ст., Кірылы Тураўскага пад назвай «Слово святаго Кирила о книжнем почитании и о учении», узгаданы намі ў пачатку нашага артыкула. Ён, як вядома, быў напісаны ў XII ст., але прычына яго напісання, думаецца, узнікла задоўга да хрышчэння Беларусі.

Як рэлігійны прапаведнік, епіскап і дасціпны абаронца маральнай чысціні нядаўна катэхізаванай паствы, Кірыла не мог не звярнуць увагу на значнае пашырэнне ў тураўскім грамадстве астралагічна-варажбіцкай практыкі і ідэалогіі. Прычым, што цікава, менавіта супраць чытання так званых «адрочаных» кніг у межах Беларусі выступіў абаронца хрысціянства, а не супраць варажбіцка-астралагічнай практыкі насельніцтва, якая, думаецца, была пашырана значна больш, чым чытанне [14].

Відаць, Кірыла бачыў той велізарны ўплыў на грамадства, які аказвае чытанне гэтых непатрэбных і шкодных, на яго думку, кніг [17]. Мала таго, яны, відаць, або іх змест, пераказаны вусна, традыцыйна выкарыстоўваліся ў выхаваўча-адукацыйным працэсе падрастаючага пакалення. І гэта, канешне, для кіраўніка епіскапіі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адказнага за будучыню нядаўна хрысціянізаванага грамадства, было недапушчальна.

«Адрочаныя» кнігі, што грунтаваліся на дахрысціянскай ідэалогіі і дасягненнях язычніцкай культуры, у пропаведзі пералічаны пайменна: «Астраномія і Заралік, Соннік, Зёльнік, Чароўнік, Птушыныя чары, Громнік, Каляднік і Жэрабнік» [18] (царк.: Астрономия, Звездочетья, Сонник, Волховник, Зелейник, Птичи чарове, Колядник, Громник, Метание) [7, с.447]. Растлумачана, чаму нельга іх чытаць, і нават дадзена водпаведзь тым (відаць, найбольш дасведчаным прадстаўнікам грамадства), якія, маючы на той час найвышэйшую адукацыю і ведаючы жыццядзейнасць айцоў царквы, маглі спытаць, чаму «святыя» таксама чыталі гэтыя кнігі.

Цікава, што Кірыла звяртаецца не толькі да дарослых людзей. Першыя словы яго пропаведзі аб недапушчальнасці чытання «адрочаных» кніг гучаць разам з тым і як зварот да дзяцей: «...послушайте, братие, и разумейте, чада...» [7, с. 447]. Канешне ж перадача ведаў новым пакаленням не магла не хваляваць палымянага хрысціяніна і епіскапа Тураўскага княства. Ён разумеў палітычную каштоўнасць новай веры і шкоднасць дахрысціянскай ідэалогіі «адрочаных» кніг. А таксама асаблівую шкоднасць іх тэарэтычнага зместу для выхаваўча-адукацыйнага працэсу і перадачы грамадскага вопыту новаму пакаленню. Яго (гэты вопыт), як вядома, царква бачыла выключна праз прызму хрысціянскай дактрыны, аскетызм і праз адмаўленне ад зямных радасцей і даброт.

Такім чынам, завяршаючы гаворку пра «адрочаныя» кнігі Кірылы Тураўскага як адну са з’яў паўсядзённасці і культуры Беларусі XII ст., зазначым, што перавод насельніцтва на хрысціянскую сістэму светаўспрымання адбываўся ў жорсткай ідэалагічнай барацьбе царкоўна-хрысціянскіх сіл з язычніцкімі. Наяўнасць феномена «адрочаных» кніг у Беларусі XII ст. (а тым больш напісанне супраць іх спецыяльнай пропаведзі мясцовым хрысціянскім ідэолагам) прыблізна праз 150–200 гадоў пасля пачатку хрысціянізацыі гэтых тэрыторый – ужо само па сабе красамоўны факт. Значыць, былі тыя, хто ўмеў чытаць іх, і тыя, каго патрэбна было засцерагчы ад гэтага.

Уплывовасць язычніцкай ідэалогіі, відаць, была яшчэ дастаткова моцная. Мала таго, зварот прапаведніка разам з дарослымі і да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяцей сведчыць, што яна была часткай зместу выхаваўча-адукацыйнага працэсу падрастаючага пакалення. А гэта пагражала стратай уплыву хрысціянскіх сіл на моладзь як будучыню грамадства.

«Адрочаныя» кнігі былі ў той час вядомай для шырокіх колаў насельніцтва Беларусі з'явай паўсядзённасці і культуры. Але гістарычная перспектыва ўжо была не за імі. І таму наш знакаміты асветнік, «златавуст» К.Тураўскі вымушаны быў умяшацца ў названы працэс і расставіць усе кропкі над «і».

---


1. *Астрология* // Словарь античности : пер. с нем. – М. : Эллис Лак : Прогресс, 1994. – С. 57–58.

2. *Барташэвіч, Г. А.* Магічнае слова: вопыт даследавання светапогляднай і мастацкай асновы замоў / Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Нар. асвета, 1990. – 55 с.

3. *Довнар-Запольский, М. В.* Чародейство в Северо-Западном крае в XVII–XVIII вв. / М. В. Довнар-Запольский // Неман. – 1996. – С. 24–35.

4. *Замовы* / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал. : А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 597 с.

5. *Лобач, У.* Чарадзейства на Полаччыне : гісторыка-культурны кантэкст / У. Лобач // Полацк : карані нашага радавода. – Полацк : Дзівосы, 1996. – 67 с.

6. *Марзалюк, І. А.* Ведаўскія працэсы ў Беларусі XVI–XVII стагоддзяў / І. А. Марзалюк // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 8. – С 32–37; гл. таксама : Марзалюк, І. А. Магія, чараўніцтва / І. А. Марзалюк // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 5. – 592 с.

7. *Мельнікаў, А. А.* Кірыл, епіскап Тураўскі. Жыццё. Спадчына. Светапогляд / А. А. Мельнікаў. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 462 с.

8. *Народный* суд литвинов над колдунами («чародеями») 1615 года / авт.-сост. : И. Я. Спрогис. – Витебск, 1896. – 127 с.

9. *Пілецкі, В. А.* Выхаваўча-адукацыйны працэс як гістарычная катэгорыя / В. А. Пілецкі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 8. – С. 49–51.

10. *Пілецкі, В. А.* Змест выхаваўча-адукацыйнага працэсу дахрысціянскай Беларусі / В.А. Пілецкі // Гісторыя : праблемы выкладання. – 2004. – № 3. – С. 3–12.

11. *Піфійскія* гульні // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 12. – 560 с.

12. *Резник, М.* Пифия [романы Прорицательница. Пифия] / М. Резник ; пер. с англ. Л. А. Ворошиловой, А. П. Мартинсона. – М. : АСТ, 1997. – 672 с.

13. *Словарь* книжников и книжности Древней Руси : в 3 вып. – Л. : Наука, 1987–1989.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Сперанский, М. Н.* Из истории отреченных книг. Вып. 4 : Аристотелевы врата, или Тайная тайных / М. Н. Сперанский. – СПб. : Импер. общ. любителей древней письменности, 1908. – 350 с.

15. *Статут* ВКЛ 1529 года. – Мінск : АН БССР, 1960. – 129 с. ; гл. таксама : Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / пер. на бел. мову А. С. Шагун. – Мінск : Беларусь, 2002. – 207 с.

16. *Судебные* процессы над ведьмами в Литве. – Вильнюс : Минтис, 1987. – 234 с. ; гл. таксама : Сперанский, Н. Ведьмы и ведовство : очерк по истории церкви и школы в Западной Европе / Н. Сперанский. – М., 1906. – 202 с.

17. *Творения* иже во святых отца нашего Кирилла, епископа Туровского. – Киев : Изд. епископа Евгения [Шерешилова], 1880. – 296 с.

18. *Тураўскі, Кірыла.* Слова святога Кірылы аб кніжным чытанні і навуцы / Кірыла Тураўскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 3. – С. 32–33.

19. *Чарадзейныя* казкі : у 2 ч. Ч. 1 : Беларуская народная творчасць / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; склад. К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч ; рэдкал. : В. К. Бандарчык [і інш.] ; уступ. арт. К.П.Кабашнікава. – 2-е выд., выпраўл і дапрац. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 639 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ